Пілігрымка ў Год Міласэрнасці і па слядах Францыска Скарыны адбылася з 20 па 30 верасня. Арганізаваў яе ксёндз
Мікалай Ліпскі
– нястомны вандроўнік. Дарэчы, гэта ўжо пятая пілігрымка па-за межамі Беларусі, якую ажыццявіў пробашч Лучайскай парафіі.
Крыху статыстычных дадзеных- за 10 дзён вандроўкі па святынях і месцах, звязаных з нашым першадрукаром-было наведана 8 гарадоў. Удзельнічала 29 чалавек, на чале з ксяндзом Мікалаем і гідам Аляксеем Шэінам. На спідометры камфартабельнага аўтобуса – 6,5 тысяч кіламетраў.







